паэзія

Віктар Сьлінко



...знайдзі свой крыжык —
і надзень на шыю...

# Іду наўздагад...

## НАКЦЮРН

Я іду. Наплывае прастора,
Не ўмяшчаецца ў зрэнкі мае.
Быццам радасьцю поўны ці горам,
Адхіснуся ізноў ад яе.
Адхіснуся назад — і растануць
Пад гарачай сьпіной камяні.
І ўваскрэснуць з былога падману
Насампраўдзе азяблыя дні.
На ільдзіне — падбітая качка.
Ну, куды ты плывеш, Рабінзон?
Хлебны мякіш падкінуць — падачку
Ці дашлюць у патроньнік патрон?
Што чакае за горадам, паркам,
Што чакае ў зімовых лясах?

А мяне — зноў каменная арка
Кліча ў свой непрадбачаны шлях.
Не суддзя я — ні птушкам, ні людзям,
Не дзялю гэты сьвет напалам.
Засынаюць ахвяры і суддзі,
І ня холадна ноччу зьвярам.
Я іду — нахінаюся ўперад
У скразьняк, у марозны сусьвет.
І зіма — павітуха памерлых —
З белых кветак мне дорыць букет.

* * *

Выспы, дрыгва... І мільгае хусьцінкі краёк.
Устаць бы з каленяў прад самай высокай сасной,
Дзе ў гольлі схаваны бурштынам мільгне абразок,
Прыбіты, напэўна, Айца альбо Сына рукой.
Гэта Духам сьвятым удыхнулі іскрынку ў цябе —
І цяпер ты гарыш, і вядзеш мяне цераз брады,
Дапамогі ня просячы, выратаваньня з бяды...
Мітусьлівыя вулкі сплываюць з душы бяз журбы,
Калі клічаш мяне, і гучаць твае «так» і «цяпер».
О, палеская радасьць нязнаных дагэтуль сустрэч!
Водар коцікаў вербных на самым парозе царквы,
І жабрачка з анёлам, што з похваў ня выніме меч,
Пакуль попел расстаньняў, дзявочых апушчаных плеч
Зноў ня стане чужым і з душой не пяройдзе на «вы».
З ручая акрапіў мяне жартам сьвятою вадой
Бог Вясны і Каханьня...
Шыбанула мне хмелем у твар
Ад таго, што было, падавалася, створана з мар,
А цяпер ажыло — і цячэ ў сініх жылках рукі...
Вось паклалі сякеры — і аб гэтым пяюць лесьнікі,
І падлесак імкнецца ня ўверх, а за мной і табой.
Нам прызначаны дзень, у які мы павінны сысьці
І пакінуць дамы, што для нас збудавалі бацькі.
Ты зьбяры хатулёк, і хай нам дапаможа анёл,
Каб ня зблыталі ў цемры
мы дрэва з высокай царквой,
Ды і сьлёз Маці Божай з жабрацкаю сьлёзкай-расой.

Праз балоты і выспы — імкніся ў хусьцінцы, бяжы
Напярэймы сабе да сустрэчы на тым рубяжы.

* * *

Той, хто пачне шкадаваць — ён прападзе.
І таму я іду наўздагад. Невядома, дзе ўсе.
Цяжка слова знайсьці, якім я змагу апісаць
Тое месца, дзе жыць мне і дзе паміраць.
Тут каменны фантан, ды вада не цурчыць анідзе.
Тут фарфоравы лебедзь па моры зялёным плыве —
Ды па моры з аблокаў. У сіняй траве не сумуй,
Меч пастаў ля сьцяны.
Як паклічуць цябе — не пачуй.
Адгукніся на голас дзіцяці, на шолах вярбы.
Тут ня знойдзеш, да кога зьвярнуцца на «вы».
І пра што шкадаваць — што са сьнегу,
З ільдоў ты,
што з крохкіх вярбовых галін
Гэты шлях, і на ім ты адзін?..

* * *

Ня стой жабрачкай ля парогу,
Дзе нават лісьця залатога
Табе шкадуе кінуць клён!

Ідзі і кліч з-пад дзірваноў
Сваіх загубленых сыноў.
Ідзі, крапі жывой вадою
З нікім ня знойдзеных крыніц,
Прынось ім з пашы сырадою,
Паі крывёю навальніц,
Дзіцём малым дзяліся з імі,
Дзяўчынай першай, любай, мілай...
Маліся, кленчы... Падай ніц.

Прыйдзі на даўнія клады
І прачытай імёны тых,
Хто тут Ільля, хто тут Кастусь,
Каго
Кахала
Беларусь.

Дык мо разбудзіш? З-пад каменьня
Ўваскрэсьне зноў жывая плоць.
Тады паверым — ёсьць Гасподзь!
І пажадаем Блаславеньня.

...Навечна мову заняло
З нястачы любасьці і веры.
Давалі здрайцам здрайцаў мерай.
З нябыту ўваскрасала тло.

Ну што маўчыш,
Мая Айчына?

* * *

*А. С.*

Сястра і брат, і вечар немаўляці
Распавядуць, хто яблыні сусед.
Хто там, за плотам, у чырвонай хаце,
І для каго гатуецца абед.

І на старой сасновае падлозе
Каму чыгун дыміцца, грэчкі пах
Дзіцячыя каму казыча ноздры...
На поплаве, у жоўта-шэрым стозе,
Дзе паляўнічыя паснулі ў кажухах, —
Сон аб дзіцяці, што згубіла крыжык.
Рыпяць на сьнезе бацькавыя лыжы.
Саломінкі на стрэльбах, у барадах.
Растопіць шэрань іхні сонны подых.
Здабудуць зьвера — вернуцца дамоў.
Як адсьвяткуюць — папалююць зноў.

Ды ім ня сьпіцца. Ў зрэбнае кашулі
Ніхто ня йдзе па сьнезе ад матулі.
Ды нехта ў сьне заўжды наводзіць рулю
На блізкага, на брата, на арла.
Прачнецца — не падымецца рука...
Таму кладзі далей сякеру, серп,
Прасі аб дараваньні ўпалы хлеб,
Усім даруй ты — покуль не асьлеп.

Знайдзі свой крыжык — і надзень на шыю.
Бліжэй туліся матчыных грудзей!
Дарма шукаць замены ім, надзей
У гэтым сьвеце! Быць дзіцём чысьцей.
Заўжды нам поле сьнегам ногі мые...